

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс**
**дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №9 (25)
Май 2022

## У нумары:

**Конкурс чытальнікаў вершаў** — **Стар. 1**
**Урок Памяці “Нам гэты свет завешчана берагчы”** — **Стар. 2**
**Урачысты мітынг Памяці** — **Стар. 3**
**Адзіны ўрок “Лёс маёй сям’і ў гісторыіі маёй краіны”** — **Стар. 4**
**Раённае свята "На100ящий пиONер_DZR"** — **Стар. 5**
**Апошні званок - 2022** — **Стар. 6**

# Конкурс чытальнікаў вершаў

1 мая ў гарадскім парку адбыўся **конкурс чытальнікаў вершаў "Усе прафесіі важныя",** прымеркаваны да свята 1 Мая. Арганізатарам конкурсу выступіла Дзяржынская раённая цэнтральная бібліятэка і прафсаюз работнікаў сістэмы адукацыі.

Вучні нашай школы прынялі актыўны ўдзел у гэтым конкурсе і былі адзначаны наступнымі ўзнагародамі: **Ярашэвіч Мар'яна**, вучаніца 7 класа - **дыплом I ступені**; **Даўгаполаў Аляксандр**, вучань 9 класа - **дыплом III ступені. Барысевіч Ганна-Марыя**, вучаніца 2 класа, **Даўгаполава Наталля**, вучаніца 4 класа, і **Даўгаполава Таццяна**, вучаніца 7 класа, былі адзначаны сертыфікатамі ўдзельніка конкурсу.

**Віншуем пераможцаў і ўдзельнікаў і жадаем далейшых творчых перамог!**







# Урок Памяці “Нам гэты свет завешчана берагчы”




Ёсць падзеі, даты, імёны людзей, якія ўвайшлі ў гісторыю кожнага горада, вёскі, краіны і нават у гісторыю ўсёй Зямлі. Пра іх пішуць кнігі, складаюць вершы, музыку, расказваюць легенды. Галоўнае ж - пра іх памятаюць. І гэтая памяць перадаецца з пакалення ў пакаленне і не дае пацямнець падзеям мінулых гадоў.

6 мая для навучэнцаў 5-9 класаў прайшоў **урок Памяці "Нам гэты свет завешчана берагчы"**, прысвечаны 77-й гадавіне Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Такі ўрок - гэта выдатная магчымасць чарговы раз абмеркаваць з падрастаючым пакаленнем важныя і лёсавызначальныя моманты Вялікай Айчыннай вайны, яшчэ раз успомніць подзвігі нашых прадзедаў.

Падчас урока вучням былі прадстаўлены эксклюзіўныя экспанаты школьнага музея "Спадчына" часоў Вялікай Айчыннай вайны. Таксама рабяты навучыліся складаць франтавыя лісты-трыкутнікі.

Урок Памяці стаў важным этапам у выхаванні паважлівых адносін да гістарычнага мінулага, у працэсе фарміравання ў вучняў аб'ектыўнага ўяўлення аб укладзе беларускага народа ў Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне, аб гераічнай спадчыне народа як важнейшага складальніка гістарычнай памяці, аб генацыдзе беларускага народа.











# Урачысты мітынг Памяці



7 мая вучні школы і педагагічны калектыў прынялі ўдзел ва ўрачыстым мітынгу Памяці, прымеркаваным 77-й гадавіне перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Перад прысутнымі выступіў дырэктар школы Крываротт Аляксандр Сяргеевіч і ганаровы госць, старшыня Фаніпальскага сельскага выканаўчага камітэта, Лобач Уладзімір Іосіфавіч. Хвілінай маўчання ўшанавалі памяць загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Таксама ў гэты дзень шэрагі ГА БРПА папоўніліся новымі членамі: у акцябраты былі прынятыя вучні 1 класа, піянерамі сталі чацвёртакласнікі.

Была пасаджана памятная алея туй.













# Адзіны ўрок “Лёс маёй сям’і ў гісторыі маёй краіны”




16 мая для вучняў 5-9 класаў прайшоў **адзіны ўрок "Лёс маёй сям'і ў гісторыі маёй краіны"**, прымеркаваны да Міжнароднага дня сям'і.

Мэта дадзенага ўрока: выхаванне грамадзянскасці, патрыятызму, фарміраванне ў вучняў сямейных каштоўнасцяў, уяўленняў аб значнасці сям'і ў жыцці грамадства, гісторыі краіны; выхаванне пачуцця гонару за сваю сям'ю, павышэнне статусу сям'і.







У 3 класе прайшло мерапрыемства **"Мая сям'я - мае крылы за спіной"**. Былі прадстаўлены калажы "Мая сям'я". Дзеці расказвалі пра сваіх блізкіх, паказвалі і распавядалі аб цікавых момантах, якія захавалі фатаграфіі. Мерапрыемства было цікавым, пазнавальным і займальным.







У 2 класе прайшла **інфармацыйная гадзіна “Дзень сям’і”**. Вучні 4 класа прынялі удзел у **віктарыне “Мая сям’я”**.






# Раённае свята "На100ящий пиONер_DZR"




19 мая 2022 года споўнілася 100 гадоў з дня заснавання самай масавай дзіцячай арганізацыі.

21 мая ў гарадскім парку адбылося раённае свята **"На100ящий пиONер_DZR"**, прысвечанае 100-годдзю піянерскай арганізацыі.

23 самых актыўных удзельнікаў піянерскіх праектаў былі занесены на Дошку гонару раённага савета ГА БРПА. Сярод іх ёсць і прадстаўнік нашай школы - **Ярашэвіч Мар'яна**, вучаніца 7 класа, намеснік старшыні школьнай піянерскай дружыны.

Падчас раённага піянерскага свята піянеры ўсклалі кветкі да стэлы вызваліцеляў і памятных знакаў герояў Дзяржыншчыны.
























# Апошні званок - 2022



30 мая прайшла ўрачыстая лінейка, прысвечаная святу "Апошні званок". Перад прысутнымі выступіў дырэктар школы Крыварот Аляксандр Сяргеевіч і запрошаныя госці.

Самым паспяховым і таленавітым вучням былі ўручаны дыпломы і граматы.

.

Для вучняў 9 класа празвінеў апошні званок. Мы жадаем ім паспяховай здачы экзаменаў і ажыццяўлення самых запаветных жаданняў!














Рэдкалегія: вучні 5 класа, Баркоўская Г.І., класны кіраўнік 5 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 30 чэрвеня.